# Інтэграцыя ў адукацыі
# Навыкувы патэнцыял дзвюх краін будзе выкарыстоўваюцца больш актыўна

**Вынікамі пасяджэння секцыі № 5 па тэме «Інтэграцыя сістэмы вышэйшай адукацыі Расіі і Беларусі: рэгіянальны аспект» стала падпісанне новых пагадненняў і ўмацаванне ўжо існуючых. Знойдзены новыя партнёры, прапрацаваны шляхі ўзаемадзеяння і абмену напрацоўкамі. У абмеркаваннях будучых механізмаў супрацоўніцтва ўзяло ўдзел каля 80 спецыялістаў у галіне вышэйшай адукацыі. Некаторыя ВНУ выйшлі на сувязь у фармаце анлайн. На думку ўдзельнікаў, адбыўся высокаканструктыўны дыялог навуковых колаў на прадмет абагульнення найлепшых дасягненняў у навуцы і адукацыі.**

— Беларусь і Расія ажыццяўляюць цеснае і ўзаемавыгаднае акадэмічнае і культурнае супрацоўніцтва ў рамках Саюзнай дзяржавы на аснове агульнай гістарычнай спадчыны, — падкрэсліў намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці, **рэктар Акадэміі паслядыпломнай адукацыі, мадэратар секцыі з беларускага боку Алег ДЗЯЧЭНКА**. — Такое супрацоўніцтва з'яўляецца гарантам устойлівага, эфектыўнага сацыяльна-эканамічнага развіцця і навукова-тэхнічнага прагрэсу Саюзнай дзяржавы, спрыяе фактарам захавання і паглыблення дружалюбных адносін паміж народамі дзвюх краін. Удзельнікі пасяджэння выказаліся за неабходнасцьдалейшай інтэграцыі нацыянальных сістэм вышэйшай адукацыі і фарміраванне адзінай адукацыйнай прасторы Саюзнай дзяржавы. Гэта будзе садзейнічаць гарманічнаму і ўсебаковаму выхаванню юнакоў і дзяўчат, фарміраваць у іх агульную высокапатрыятычную фактарам захавання і паглыблення дружалюбных адносін паміж народамі дзвюх краін. Удзельнікі пасяджэння выказаліся за неабходнасцьдалейшай інтэграцыі нацыянальных сістэм вышэйшай адукацыі і фарміраванне адзінай адукацыйнай прасторы Саюзнай дзяржавы. Гэта будзе садзейнічаць гарманічнаму і ўсебаковаму выхаванню юнакоў і дзяўчат, фарміраваць у іх агульную высокапатрыятычную свядомасць, што дапаможа эфектыўна супрацьдзейнічаць спробам фальсіфікаваць факты гісторыі.



Падчас работы секцыі было падпісана 17 пагадненняў, з іх шэсць у рэжыме анлайн. Некалькі сур'ёзных праектаў будуць развіваць магілёўскі Беларуска-Расійскі ўніверсітэт і дзве вышэйшыя ўстановы Санкт-Пецярбурга — аграрны і політэхнічны ўніверсітэты. З апошнім, напрыклад, падпісаны Дагавор аб рэалізацыі адукацыйнай праграмы ў сферы наземных транспартна-тэхналагічных комплексаў і замежнага рэгіёназнаўства.

Алег Дзячэнка адзначыў, што падчас работы секцыі быў выпрацаваны пералік неабходных мер, якія плануецца рэалізаваць сумесна з Пастаянным камітэтам Саюзнай дзяржавы да 2025 года. Гэта забеспячэнне пашыранага міжуніверсітэцкага супрацоўніцтва для нарошчвання патэнцыялу ў адукацыйнай, навуковай і інавацыйнай сферах; удасканаленне практык сумесных адукацыйных праграм з магчымасцю выданы студэнтам двух дыпломаў па найбольш запатрабаваных спецыяльнасцях вышэйшай адукацыі; пашырэнне практыкі павышэння кваліфікацыі кіраўнікоў, спецыялістаў, педагагічных кадраў ва

ўстановах дадатковай адукацыі і адукацыйных цэнтрах Беларусі і Расіі.

**Нэлі ЗІГУЛЯ**